# ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

## НОВЫ ГОД – ЧАС ПАДАРУНКАЎ, ЗДЗЯЙСНЕННЯ ЖАДАННЯЎ І САПРАЎДНАГА ЧАРАЎНІЦТВА




**Фотаздымак з аўтарскага дапаможніка для фарміравання паняццяў дзяцей дашкольнага ўзросту аб прафесіях дарослых**

## ОЙ, КАЛЯДАЧКІ, БЛІНЫ-ЛАДАЧКІ!

Калядкі – адно з самых старажытных святаў, якія азначаюць сабой пераход ад старога года да новага.



Калядкі заўсёды адзначалі весела і лічыліся святам моладзі. Яны былі напоўнены музыкай, спевамі, гульнямі, снежнымі забавамі.



У Беларусі 12 студзеня ва ўсіх школах і класах прайшоў адзіны ўрок, прысвечаны трагедыі вёскі Ала Светлагорскага раёна.

## АДЗІНЫ ЎРОК "АЛА - СЯСТРА ХАТЫНІ"

## ДЗЕНЬ У МЕДЫЯРЫТМЕ

**Дзень адчыненых дзвярэй на факультэце журналістыкі БДУ.**

Такое мерапрыемства на журфаку БДУ ўпершыню



правялі ў фармаце ток-шоу. Гасцямі факультэта сталі вядомыя журналісты.




На мерапрыемстве ад нашай установы адукацыі прысутнічала Леанец Анастасія – член клуба рэдактараў Дзяржынскага раёна.

*У ГЭТЫМ ВЫПУСКУ*

**КАЛЯДЫ**
*Калядоўшчыкі віншуюць жыхароў аг.Грычына*

**АЛА – СЯСТРА ХАТЫНІ**
*Адзіны ўрок, прысвечаны трагедыі вёскі Ала*

**ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ**
*Дзень адчыненых дзвярэй на факультэце журналістыкі БДУ*

01.02.2024 / / ЧАЦВЕР / / 5 ВЫПУСК

# ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»




ГЕРМАНОВІЧ КСЕНІЯ,
8 КЛАС

**З 6 па 19 студзеня ў беларусаў доўжыцца двухтыднёвы святочны перыяд — «Каляды».**

Сустракаць іх прынята ярка, шумна, весела. Народныя традыцыі заўсёды актыўна падтрымліваюць і жыхары Дзяржынска. Які год запар на цэнтральнай плошчы разгортваецца вялікае свята з усімі тэматычнымі атрыбутамі. Нягледзячы на марозны дзень, «Каляды» сабралі нямала ахвотных адпачыць і павесяліцца. Гасцей забаўлялі народнымі забавамі, конкурсамі і разнастайнымі экспазіцыямі.



**Калядкі - адно з самых старажытных святаў, якія азначаюць сабой пераход ад старога года да новага.**

Калядкі заўсёды адзначалі весела і лічыліся святам моладзі. Яны былі напоўнены музыкай, спевамі, гульнямі, снежнымі забавамі.



## *Прыйшла каляда да вашага двара!*

САВЕНОК ГАННА,
8 КЛАС

На Каляды і Новы год па вёсках хадзілі калядоўшчыкі, жадалі гаспадарам дабра, любові, багацця, выконвалі віншавальныя песні, за што іх дзякавалі багатым пачастункам.



**6 студзеня ініцыятыўныя навучэнцы нашай школы правялі калядкі "Каляда, каляда, бедам – не, а шчасцю – так!", яны выступілі ў ролі калядоўшчыкаў. Па старадаўніх звычаях наведалі дамы аднавяскоўцаў і павіншавалі з Раством Хрыстовым.**



ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»



**Прадстаўнікі факультэта падрабязна расказалі пра асаблівасці паступлення на журфак у 2024 годзе, адказалі на шматлікія пытанні абітурыентаў, якія датычацца ўступных экзаменаў, публікацый, падрыхтоўчых курсаў, студэнцкага жыцця і інш.**

**Таксама рабятам расказалі аб структуры факультэта, спецыяльнасцях, асаблівасцях навучальнага працэсу, міжнародных сувязях, месцах працаўладкавання.**



А яшчэ для ўдзельнікаў была арганізавана экскурсія па факультэце: члены клуба рэдактараў пабывалі ў Беларуска-кітайскім медыяцэнтры, наведалі радыёстудыю і тэлепавільён, тэлеклас і камп'ютарны клас, музей гісторыі журналістыкі і медыятэку.





Рабят пазнаёмілі з асаблівасцямі работы ў студыі і на здымачнай пляцоўцы, даючы магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі вядучых тэлевізійных навін і радыёперадач, некаторыя ўдзельнікі далі сваё першае інтэрв'ю.



Сустрэча была па-хатняму ўтульнай, пазнавальнай, цікавай і інфарматыўнай, што дазволіла многім абітурыентам канчаткова вызначыцца з выбарам сваёй будучай прафесіі.

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

**ЛЕАНЕЦ АНАСТАСІЯ, 8 КЛАС**

**Дзень адчыненых дзвярэй на факультэце журналістыкі БДУ прайшоў пад назвай "Дзень у Медыярытме".**



Такое мерапрыемства на журфаку БДУ ўпершыню правялі ў фармаце ток-шоу. Гасцямі факультэта сталі вядомыя журналісты.

Перш студэнтка 1 курса Э. Коўшэр падрыхтавала яркую прэзентацыю і пазнаёміла ўсіх прысутных з факультэтам журналістыкі. Далей для рабят выступалі дэкан факультэта А.В.Бяляеў, які паведаміў аб плане прыёму на факультэт у 2024 годзе. Намеснік дэкана па прафарыентацыйнай дзейнасці Г. Басава расказала пра падрыхтоўчыя курсы, заняткі ў Школе маладога журналіста. А таксама прысутнічалі запрошаныя госці – вядомыя выпускнікі.



01.02.2024 / / ЧАЦВЕР / / 5 ВЫПУСК

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

# АДЗІНЫ ЎРОК "АЛА - СЯСТРА ХАТЫНІ"

СІНЕВІЧ ДАР'Я,

8 КЛАС

**У Беларусі 12 студзеня ва ўсіх школах і класах прайшоў адзіны ўрок, прысвечаны трагедыі вёскі Ала Светлагорскага раёна.**




З навучэнцамі пагаварылі пра генацыд беларускага народа, згадалі таксама пра трагедыю ў Хатыні. Многія беларускія вёскі маюць гісторыю, падобную да гісторыі Хатыні. Так, у вёсцы Ала загінула 1758 чалавек, у тым ліку 950 дзяцей, 508 жанчын, 100 мужчын і 200 старых.

У ходзе мерапрыемства навучэнцам была прадстаўлена трагічная гісторыя, якая напаткала мірных жыхароў в. Ала. Разам дзеці паглядзелі відэаролік праекта Генеральнай Пракуратуры РБ "Звычайны генацыд. Ала", а пасля абмеркавалі прагледжаныя кадры.

Рабяты зрабілі выснову: *кожны грамадзянін павінен памятаць і ведаць сваю гісторыю, каб перадаць наступным пакаленням. Як бы нам не было цяжка ўспамінаць тыя крывавыя і жудасныя моманты ў нашай гісторыі, мы павінны гэта рабіць. Бо толькі так можам не дапусціць паўтарэння гэтых страшных часоў.*

**Кароткая гісторыя трагедыі:**

У 6 гадзін раніцы 14 студзеня 1944 года вёску акружыў нямецкі карны атрад. Пад стрэлы і брэх сабак усіх жыхароў вёскі Ала сагналі ў вялікі калгасны хлеў. Тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі. Тых, хто хаваўся ў зямлянках і ямах, знаходзілі сабакі.
З хлява людзей забіралі групамі, тлумачачы, што будуць адвозіць у тыл, але насамрэч адводзілі ў іншы канец вёскі, запіхвалі ў дамы і падпальвалі.

Тых, хто выбягаў з полымя, забівалі. Выратавацца ўдалося нямногім. Адным са сведкаў трагедыі стаў жыхар Алы Арцём Усціменка. Падчас вайны ён быў у партызанскім атрадзе. У той страшны дзень прыйшоў у родны дом. На свае вочы бачыў, як карнікі наблізіліся да вёскі і акружылі яе. Ён вырашыў, што прыйшлі забіраць мужчын, і схаваўся на гарышчы. Адчуўшы пах дыму, саскочыў і стаіўся ў кустах, дзе і праляжаў да самага вечара. А калі сцямнела, устаў і пайшоў да тлеючых дамоў, але ў жывых ужо нікога не засталося.



Гаўрыіл Кандрацьевіч Зыкун за некалькі гадзін да трагедыі сышоў з сям'ёй у лес, а па вяртанні праз некалькі дзён убачыў згарэлыя хаты і загінулых людзей.









01.02.2024 / / ЧАЦВЕР / / 5 ВЫПУСК

# ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»











## РАЁННАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА “ДЗЕЦІ Ў ТЭМЕ!”

## “Прафесіі дарослых вачыма дзяцей”

**САВЕНОК ГАННА, 8 КЛАС**

**Хто пачынае дзень?**

*Устане рана хлебапек, адчуе смачны пах,*
*І пойдзе жытні свежы хлеб з румянцам на шчаках.*
*Па- свойму радуе маляр прыроду і людзей:*
*прыносіць колеры вясны вяселы чарадзей.*
*Спытайся ў сонца і зямлі, спытайся ў чыстых рэк:*
*- Хто пачынае ровы дзень? – Рабочы чалавек!*

***Э.Агняцвет***

# НАВІНЫ ДЗІЦЯЧАГА САДА

**З 15 студзеня стартавала раённая адукацыйная ініцыятыва “Дзеці ў тэме! Прафесіі дарослых вачыма дзяцей”**



Для выхаванцаў нашага дзіцячага сада праведзены рознага роду тэматычныя мерапрыемствы, у тым ліку распрацаваны аўтарскія дапаможнікі для фарміравання паняццяў дзяцей дашкольнага ўзросту аб прафесіях дарослых, падрыхтаваны відэаролік “Прафесіі дарослых вачыма дзяцей”.



На мерапрыемствах рабяты слухалі вершы і апавяданні, разглядалі ілюстрацыі з выявай людзей розных прафесій (цырульнік, кіроўца, прадавец, настаўнік, кухар, аграном). Дзеці з задавальненнем паспрабавалі сябе ў ролі будаўнікоў – будавалі дамы з канструктара.



Гаварылі аб прафесіях супрацоўнікаў дзіцячага садка, прафесіях бацькоў.



01.02.2024 / / ЧАЦВЕР / / 5 ВЫПУСК

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

# ПРАВІЛЫ БЯСПЕЧНЫХ ПАВОДЗІН НА ЧЫГУНЦЫ

ЗАБАРОНЕНА ХАДЗІЦЬ ПА ЧЫГУНАЧНЫХ ПУЦЯХ



ЗАБАРОНЕНА ПАДКЛАДАЦЬ СТАРОННІЯ ПРАДМЕТЫ ПАД РЭЙКІ



ЗАБАРОНЕНА КІДАЦЬ СТАРОННІМІ ПРАДМЕТАМІ Ў ЦЯГНІКІ



ЗАБАРОНЕНА ПЕРАБЯГАЦЬ ЧЫГУНКУ ПЕРАД ІДУЧЫМ ЦЯГНІКОМ



ЗАБАРОНЕНА ПАДЛАЗІЦЬ ПАД ЦЯГНІК

